ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

СТУДЗЕНЬ ЛЮТЫ

Віцебск 2017

ГУ “ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМ. В. И. ЛЕНИНА”
Отдел краеведческой литературы и библиографии

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Студзень–люты

2017

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2017

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *Л. І. Рагачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : студзень–люты : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2017. – 46 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Студзень–люты

2017

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 студзеня па 28 лютага 2017 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

У студзені з рабочай паездкай у Аршанскім раёне пабываў міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, які правёў прыём грамадзян у г. п. Копысь. Размова ішла ў тым ліку і пра культурнае жыццё гарпасёлка. У ходзе візіту Б. Святлоў наведаў асноўныя культурныя аб'екты Копысі: Пятроўскі вал, Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў, мясцовы Дом культуры.

27 студзеня прайшло пасяджэнне Шаркаўшчынскага райвыканкама. З дакладам «Аб рабоце ўстаноў культуры па арганізацыі вольнага часу і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў» выступіла намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама І. М. Шынкевіч. Яе выступленне дапоўнілі работнікі культасветустаноў раёна. Начальнік аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Г. Ф. Баркевіч дала ацэнку рабоце ўстаноў культуры раёна і акрэсліла накірункі іх далейшай дзейнасці.

27 студзеня адбылося пасяджэнне Міёрскага райвыканкама, на якім у ліку асноўных пытанняў была разгледжана дзейнасць устаноў культуры раёна па развіцці народнай творчасці і захаванні традыцый. Станоўчую ацэнку патэнцыялу Міёршчыны па зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны, падтрымцы творчых ініцыятыў даў галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама С. Генеральніцкі.

31 студзеня ва Ушацкім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці была праведзена выніковая нарада, прысвечаная Году культуры. Са справаздачным дакладам аб дзейнасці ўстаноў культуры раёна ў 2016

спартыўны клуб «Азімут» і інш. Упрыгажэннем балю Папялушкі сталі лазернае шоу і шоу мыльных пузыроў з Мінска. (*Пастаўскі край. – 2017. – 6 студз. – С. 8.*)

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,
якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага райвыканкама і Цэнтр беларускай культуры (г. Даўгаўпілс, Латвія). Прадугледжана рэалізацыя сумесных праектаў па развіцці міжэтнічнага і міжкультурнага дыялога, садзейнічанне ў правядзенні сумесных даследаванняў па праблемах гісторыка-культурных сувязяў народаў Латвіі і Беларусі, арганізацыя шэрагу азнаямляльных, адукацыйных, культурных і турыстычных паездак з мэтай распаўсюджвання інфармацыі пра вопыт і дасягненні прыдзвінцаў і латышоў у галіне прапаганды культурнай спадчыны абедзвюх краін. (*Жыццё Прыдзвіння. – 2017. – 6 студз. – С. 1.*)

Год культуры на Аршаншчыне завяршыўся візітам у рэгіён першага сакратара Пасольства Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Юліі Рачынскі-Співакоў па запрашэнні Аршанскай яўрэйскай абшчыны. Намесніка Пасла дзяржавы Ізраіль прымалі ў Лядовай арэне, дзе высокая госця стала ўдзельніцай святочнай канцэртнай праграмы, падрыхтаванай удзельнікамі народнага ветэранскага клуба «Еще не вечер». У сустрэчы прынялі ўдзел прадстаўнікі Аршанскага райвыканкама Ганна Святлова і Іна Шурміна. (*Аршанская газета. – 2017. – 14 студз. – С. 4.*)

Напярэдадні навагодніх святаў у аграгарадку Боркавічы Верхнядзвінскага раёна была вырашана праблема з размяшчэннем клуба, бібліятэкі і музычнай школы. Зараз яны знаходзяцца ў адным будынку, і з гэтай нагоды ў новым сацыяльна-культурным комплексе адбылося святочнае мерапрыемства. (*Дзвінская праўда. – 17 студз. – С. 7.*)

25 і 26 снежня з аншлагам прайшлі прэм’ерныя паказы навагодняй казкі «Папялушка» ў Пастаўскім раённым Доме культуры. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр Алена Слядзеўская. Традыцыйны сюжэт «Папялушкі» трапна дапаўнялі ансамбль барабаншчыц Пастаўскай ДШМ, узорныя студыі «Юніта» і «Каскад», раённы маладзёжны ваенна-

годзе выступіла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама С. В Азевіч. Дыпломамі былі ўзнагароджаны самыя актыўныя спонсары ў галіне культуры. Адбыўся вялікі справаздачны канцэрт творчых калектываў і выканаўцаў Ушаччыны.

3 лютага ў Канцэртнай зале «Віцебск» адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2016». Дыпломы лаўрэатаў атрымалі 100 прадстаўнікоў розных галін. У намінацыі «Культура. Мастацтва. Духоўнае адраджэнне» ўзнагароджаны намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама **Аленская Ларыса Канстанцінаўна**, дырэктар установы культуры «Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова» **Шышкова Ірына Аляксандраўна**, загадчык аддзела фальклору і народных традыцый раённага цэнтра культуры дзяржаўнай установы культуры «Лёзненская цэнтралізаваная клубная сістэма» **Макраусава Ганна Фёдараўна**.

Віцебскі аблвыканкам прызнаны лепшым у сферы рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі. Адпаведны Дыплом быў уручаны намесніку старшыні аблвыканкама **Уладзіміру Пеніну** на выніковай калегіі Міністэрства культуры **8 лютага** ў г. Бабруйску. Лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Чалавек Года культуры» стала дырэктар Дома рамёстваў і фальклору Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна **Марына Гушча** ў намінацыі «Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». Старшыні Наваполацкага гарвыканкама **Дзмітрыю Дзямідаву** быў уручаны Дыплом пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры ў Год культуры» ў намінацыі «Лепшы горад абласнога падпарадкавання». (*Витебские вести. – 2017. – 11 февр. – С. 1.*)

14 лютага ў Гарадку была праведзена выніковая калегія галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі

Віцебскага аблвыканкама. Начальнік галоўнага ўпраўлення Генадзь Міхайлавіч Ягораў у сваім выступленні спыніўся на галоўных накірунках ідэалагічнай работы, адзначыў адказны і творчы падыход да сваёй справы ідэалагічнага актыву, наладжванне цесных сувязяў з працоўнымі калектывамі, прафсаюзнымі і грамадскімі арганізацыямі, Саветамі дэпутатаў. Асаблівую ўвагу ён надаў дзейнасці па ўвекавечанні памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны і ахвяр войн на тэрыторыі краю. Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення Ларыса Канстанцінаўна Аленская ў сваім выступленні адзначыла пэўныя дасягненні ўстаноў культуры і мастацтва вобласці, поспехі майстроў народнай творчасці, творчых калектываў і выканаўцаў, мастакоў і літаратараў. У Год культуры на Віцебшчыне было праведзена звыш 119 тысяч культурных мерапрыемстваў, рэалізоўваліся новыя праекты, вялася работа па ўзмацненні матэрыяльна-тэхнічнай базы. У абласным аглядзе-конкурсе творчых калектываў, прысвечаным Году культуры, прынялі ўдзел звыш 14 тысяч чалавек з усіх рэгіёнаў вобласці. Актыўную і прадуктыўную дзейнасць ідэалагічных работнікаў і культработнікаў вобласці адзначылі выступіўшыя на калегіі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама У. П. Пенін, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь В. М. Чэрнік. **Уладзіміру Цярэнцьеву** быў уручаны знак Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». Ганаровымі граматамі былі адзначаны лепшыя работнікі культуры, узнагароды атрымалі пераможцы конкурсу на лепшы стан ідэалагічнай работы ў арганізацыях вобласці за 2016 год. На калегіі былі ўганараваны лаўрэаты прэміі Віцебскага аблвыканкама за высокія дасягненні ў галіне культуры і мастацтва за мінулы год. Імі ў розных намінацыях сталі: Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна (дырэктар **Таццяна Адамян**), Велеўшчынская сельская бібліятэка-клуб Лепельскага раёна (загадчык **Ганна Дзямко**), Чырванараніцкая сельская бібліятэка Чашніцкага раёна (загадчык **Алена Мядзюк**), Цэнтр культуры «Віцебск» (дырэктар

віцебскіх школ танца годна прадставілі вобласць і неаднарозова ўзнімаліся на п’едэстал.

15-годдзе з дня стварэння адзначыла харэаграфічнае аддзяленне Расонскай дзіцячай школы мастацтваў. З гэтай нагоды на сцэне раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці адбыўся канцэрт «15 лет дорогою танца».

тэатра імя Я. Коласа, у Духоўнай семінарыі і Віцебскім дзяржаўным музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага. У праграму былі ўключаны не толькі творы акадэмічнай, камернай духоўнай музыкі, але і калядныя, народныя песні.

8 студзеня ў Полацкім Сафійскім саборы адбыўся калядны канцэрт-фестываль харавых калектываў у межах свята духоўнай музыкі «Каляднае сугучча». Удзельнічалі Архірэйскі хор Полацкага Богаяўленскага сабора, выхаванцы дзіцячых школ мастацтваў Полацка і Наваполацка, харавыя калектывы Полацкага каледжа ВДУ імя П. М. Машэрава і наваполацкай СШ № 3, ансамбль «Своя игра» Наваполацкага музычнага каледжа, іншыя калектывы і выканаўцы.

У Верхнядзвінскім РЦКНТ прайшоў V калядны фестываль «Падарунак з нябёсаў». У святочнай праграме выступілі Сімфанічны аркестр Віцебскай абласной філармоніі (мастацкі кіраўнік У. Бяляўскі) і выхаванцы Верхнядзвінскай дзіцячай школы мастацтваў.

14 лютага ў Віцебскай абласной філармоніі прайшоў канцэрт «Оперетта, виват!», прымеркаваны да 15-годдзя творчай дзейнасці салісткі філармоніі Аксаны Новікавай.

Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. І. Салярцінскага **27 лютага** канцэртам «Магия ритма» адкрыў серыю вучэбных, пазнавальных, культурных падзей, прсвечаных 100-годдзю навучальнай установы. Упершыню ў каледжы выкарысталі новае канцэртнае светлавое абсталяванне, набытае ў Год культуры.

ХАРЭАГРАФІЯ

21–22 студзеня на сцэне Канцэртнай залы «Віцебск» адбыўся XXXII конкурс па спартыўных бальных танцах «Віцебская сняжынка» – старэйшы танцавальны турнір у Беларусі, які мае статус Міжнароднага і праходзіць пад эгідай WDSF (World Dance Sport Federation). Удзел у конкурсе прынялі звыш 500 пар з 23 краін свету, якія выступалі ў 7 узроставых групах (ад пяцігадовых дзяцей да сеньёраў). Прадстаўнікі

Аляксандр Сідарэнка), Глыбоцкі Дом рамёстваў (загадчык **Святлана Скавырка**), Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна (дырэктар **Іна Ляўковіч**), Багатырскі СДК Полацкага раёна (дырэктар **Алена Лукавіцкая**), Гарадоцкі раённы музей (дырэктар **Тамара Іванова**), Шумілінская дзіцячая школа мастацтваў (дырэктар **Галіна Мацвяйчук**), Наваполацкая дзіцячая мастацкая школа імя І. Хруцкага (дырэктар **Аксана Тарасікава**).У рамках мерапрыемства адбылася прэзентацыя клубаў народных майстроў і выступленне вядомых калектываў Гарадоччыны. (*Витебские вести. – 2017. – 16 февр. – С. 1, 5.* ; *18 февр. – С. 5.)*

Вядучы метадыст па народным сцэнічным касцюме Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці **Людміла Вакар**, якая вывучае гісторыю традыцыйнага народнага касцюма Віцебшчыны, удастоена гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Лёзненскім культурна-аздараўленчым комплексе **ў лютым** была праведзена выязная сесія Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў, на якой у шэрагу іншых разглядалася пытанне «Аб зацвярджэнні раённага комплексу мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі на 2016–2020 гады». Дэпутаты райсавета пазнаёміліся з дзейнасцю Дома рамёстваў і цэнтральнай раённай бібліятэкі. Выхаванцы і педагогі Лёзненскай ДШМ падрыхтавалі для ўдзельнікаў сесіі невялікі канцэрт.

15 лютага ў вобласці прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У 28-ю гадавіну вываду войскаў з Афганістана ў кожным раёне адбыліся мітынгі і ўскладанне вянкоў і кветак да мемарыялаў воінам-інтэрнацыяналістам. У Віцебску месцам сустрэчы ўдзельнікаў баявых дзеянняў, сем’яў загінуўшых, прадстаўнікоў грамадскасці традыцыйна стаў помнік «Боль». У гэты дзень у абласным цэнтры была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка лейтэнанту, штурману-лётчыку Сяргею Чарнышову, загінуўшаму пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу ў Афганістане.

17 лютага адбылося пасяджэнне савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама, на якім былі падведзены вынікі дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва за 2016 год. ДШМ № 3 «Маладзік» удастоена дыплома абласнога агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах у намінацыі «Культура». Ганаровай граматай Віцебскага аблвыканкама за вялікі ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, актыўную работу па патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення ўзнагароджаны Музей Марка Шагала ў Віцебску. Падзяка старшыні аблвыканкама за шматгадовую плённую працу па эстэтычным выхаванні моладзі, значны ўклад у падрыхтоўку кадраў у галіне культуры, высокія творчыя дасягненні аб'яўлена калектыву ДШМ № 1 Віцебска.

Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, прайшлі **23 лютага** па ўсёй вобласці. Да помнікаў і месцаў масавага пахавання загінуўшых ваеннаслужачых былі ўскладзены вянкі і кветкі, ва ўстановах культуры і адукацыі праходзілі канцэрты і тэматычныя праграмы. Кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі дэпутацкага корпусу, прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый традыцыйна сабраліся ля манумента савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам у Віцебску. Там прайшоў мітынг, адбыўся парад войскаў віцебскага гарнізона. У канцэртнай зале «Віцебск» былі праведзены ўрачысты сход і святочны канцэрт.

28 лютага – 1 сакавіка ў Оршы праходзіла выязное пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэце і фінансах. Саюзныя парламентарыі абмеркавалі актуальныя пытанні развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва двух дзяржаў, пабывалі на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны Аршаншчыны. Былі разгледжаны інфармацыя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і прапановы па далейшым супрацоўніцтве ў вобласці зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны беларуска-расійскага пагранічча ў межах Саюзнай дзяржавы. (*Аршанская газета. – 2017. –*

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

«Сцэна – тэрыторыя любові» – пад такой назвай **26 студзеня** ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа адбыўся творчы вечар народнай артысткі Беларусі, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» Святланы Акружной з нагоды яе 70-гадовага юбілею. 47 гадоў актрыса прысвяціла коласаўскай сцэне і сыграла звыш 60 роляў. Свой юбілейны вечар Святлана Арцёмаўна правяла ў форме монаспектакля. Гучалі віншаванні, уручаліся граматы. Першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга зачытала віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў гонар юбіляра.

8 лютага ў тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Калісь глядзеў на сонца я…» – аповед пра Максіма Багдановіча. Сцэнарый і пастаноўка Святланы Жукоўскай і Наталлі Аладкі. Музыка і музычнае афармленне Аляксандра Крыштафовіча. У ролі Максіма Багдановіча – Яўген Лук'янаў.

18 і 19 лютага на сцэне Коласаўскага тэатра адбылася прэм'ера камедыі «Хітрыкі Скапэна» па п'есе Жана-Батыста Мальера. Рэжысёр Ірына Цішкевіч, мастак-пастаноўшчык Юлія Карымава, харэограф Дзіяна Юрчанка, кампазітар Аляксандр Крыштафовіч. Пераклад Пятра Ламана. У ролі Скапэна – акцёры Цімур Жусупаў і Раман Салаўёў.

21 лютага Беларускі тэатр «Лялька» зрабіў падарунак гледачам да Дня роднай мовы. Адбылася прэм'ера інтэрактыўнай казкі «Вясёлы Дарафей». Рэжысёр Віктар Клімчук, мастак Крысціна Баранава, кампазітар Алена Пеле. У ролях Марыя Кавалёва, Алесь Казлоў, Вольга Лазебная, Вольга Маханькова, Ганна Сцепанец.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

7–8 студзеня ў Віцебску адбылося традыцыйнае свята духоўнай музыкі «Каляднае сугучча», у якім прынялі ўдзел лепшыя харавыя калектывы Віцебска і Віцебскай вобласці, а таксама 7 калектываў з Расіі. Канцэрты прайшлі на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага

У Полацкай мастацкай галерэі адкрылася выстава работ вядомага беларускага акварэліста, супрацоўніка часопіса «Мастацтва» Вячаслава Паўлаўца пад назвай «Каляровая плынь». Быў дадзены старт новаму праекту «Вада + фарба +», прысвечанаму акварэлі. В. Паўлавец правёў майстар-клас і падзяліўся сакрэтамі нараджэння мастацкага твора.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

10 лютага ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбылося адкрыццё абласной выставы-продажу «Святочны сувенір», на якой прадстаўлены вырабы майстроў Дамоў і Цэнтраў рамёстваў Віцебшчыны, выкананыя ў розных тэхніках народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. Грамыкі **ў лютым** адкрылася выстава «Смоленские украсы». У экспазіцыі прадстаўлены дыпломныя работы выпускнікоў каледжа Смаленскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў: нацыянальныя касцюмы, галаўныя ўборы, узоры адзення, сцэнічныя касцюмы, дэкаратыўныя пано і інш. Усе экспанаты аздоблены ручной вышыўкай.

У Доме рамёстваў Чашніцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці адбылася сустрэча з вядомым майстрам па кераміцы і разьбе па дрэве Уладзімірам Якаўлевічам Яленскім, прысвечаная 60-гадоваму юбілею таленавітага мастака. Багаты творчы шлях юбіляра адлюстравала выстава «Філасофія дрэва».

КІНАМАСТАЦТВА

У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 79 ад 27.01.2017 г. адкрыты конкурс аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча «Я здымаю кіно», які з поспехам праходзіць на Полаччыне, набыў статус рэспубліканскага.

4 сак. – С. 2.)

Спецыялісты аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Расонскага райвыканкама правялі выніковы сход з работнікамі галіны **ў лютым**. Ганаровымі граматамі былі адзначаны захавальнік фондаў Расонскага музея баявой садружнасці Таццяна Бегляцова, дырэктар дзіцячай школы мастацтваў Алена Парфёнава, бібліятэкар Заборскай бібліятэкі Тамара Мацулевіч, мастацкі кіраўнік Клясціцкага СДК Святлана Траццякова.

Напрыканцы лютага работнікі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама на справаздачным сходзе падвялі вынікі работы ўстаноў культуры і мастацтва за 2016 год. Лепшыя работнікі культуры былі адзначаны прэміяй Глыбоцкага райвыканкама, Ганаровымі граматамі і Падзякамі.

На нарадзе работнікаў культуры Дубровеншчыны, якая адбылася ў раённым Доме культуры **напрыканцы лютага**, былі падведзены вынікі 2016 года, намечаны планы на 2017 год. У намінацыі «Чалавек года культуры Дубровенскага раёна» сталі Надзея Дударава, Уладзімір Бабічаў і Аляксандр Хацееў. Узорны тэатр моды «Меланж» быў прызнаны лепшым у намінацыі «Клубнае фарміраванне Года культуры Дубровенскага раёна».

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Латвійскі горад Дагда –пабрацім г. Дуброўна – **30 студзеня** святкаваў 25-годдзе прысваення яму статуса горада. З юбілеем жыхароў Дагды павіншавала начальнік аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Галіна Баркевіч. Прывітальны адрас ад старшыні Дубровенскага райвыканкама агучыла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Людміла Дударава. Вакальная група «Спатканне» аўтаклуба ДУК «Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага раёна» выступіла з канцэртнай праграмай.

2 лютага старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. Цярэнцьеў, старшыня Лёзненскага райвыканкама І. Лаўрыновіч і старшыня Лёзненскага райсавета дэпутатаў Т. Дрылёнак пабывалі ў Веліжскім раёне Смаленскай вобласці, дзе быў падпісаны бестэрміновы дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж двума пагранічнымі рэгіёнамі. Дагавору папярэднічаў культурны абмен, пачаты ў мінулыя гады. Дэлегацыя наведала ў Веліжы гісторыка-краязнаўчы музей, школу, праваслаўны дзіцячы сад, храм у гонар святых роўнаапостольных Кірыла і Мяфодзія, усклала кветкі да мемарыяла «Лидова гора».

7–10 лютага на Полаччыне пабывала дэлегацыя з горада-пабраціма Цхалтуба (Грузія). На афіцыйным прыёме ў Полацкім райвыканкаме было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж гарадамі Цхалтуба і Полацкам на 2017–2018 гады. Пагадненне прадугледжвае развіццё адносін у сферы эканомікі, адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту, турызму. Гасцям быў перададзены Дыплом III адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў «Я здымаю кіно» імя Юрыя Тарыча, у якім творчая група з Цхалтуба атрымала Гран-пры за лепшую рэжысёрскую работу ў намінацыі «Дакументальны фільм». У ходзе візіту для грузінскай дэлегацыі была падрыхтавана насычаная дзелавая і культурная праграма.

Дэлегацыя Віцебскай вобласці на чале з начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзем Ягоравым прыняла ўдзел у пасяджэнні Савета па культуры і турызме пры губернатары Смаленскай вобласці, на якім абмяркоўвалася супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь. У ходзе сустрэчы было адзначана, што супрацоўніцтва ў сацыяльна-культурнай сферы паміж Віцебскай і Смаленскай абласцямі пастаянна развіваецца і пашыраецца, у 2017 годзе запланаваны новыя сумесныя праекты. (*Витебские вести. – 2017. – 11 февр. – С. 3.*)

8–10 лютага праходзіў візіт у Віцебскую воласць Надзвычайнага

экспазіцыі былі прадстаўлены 70 твораў жывапісу, графікі, акварэлі, керамікі, медальернага мастацтва. У адкрыцці выставы прыняў удзел консул Латвіі ў Віцебску Угіс Скуя, які выказаў надзею на далейшае супрацоўніцтва паміж нашымі народамі і творчымі людзьмі.

У выставачнай зале музеі гісторыі і культуры Наваполацка **ў студзені** экспанавалася выстава акварэльных работ наваполацкага мастака Георгія Танковіча. У экспазіцыі былі прадстаўлены творы розных гадоў і жанраў: пейзажы, тэматычныя карціны, краявіды, нацюрморты.

3 лютага віцебскі мастак Уладзімір Напрэенка адкрыў сваю персанальную выставу «Мелодыя акварэлі» ў Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі.

4 лютага ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава, на якой былі прадстаўлены работы ўдзельнікаў мастацкага пленэру «Пачаткі», які праходзіў у Друі пры касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў 2016 годзе. Удзел у адкрыцці выставы прыняў біскуп Віцебскі Алег Буткевіч.

22 лютага ў Мастацкім музеі Віцебска адбылося адкрыццё выставачнага праекта, прысвечанага 65-годдзю Віцебскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў Беларусі. У мастацка-дакументальны праект увайшоў 91 твор 58 жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Знакавай падзеяй на прэзентацыі маштабнай рэтраспектыўнай экспазіцыі стала ўручэнне ордэна Францыска Скарыны заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны **Аляксандру Аляксандравічу Салаўёву**. На юбілейным вернісажы атрымалі ўзнагароды і іншыя творцы. Аляксандру Малею была ўручана грамата Міністэрства культуры Беларусі, Мікалаю Гугніну – Ганаровая грамата Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Азат Тарасян узнагароджаны Ганаровай граматай Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Аршанскі мастак Уладзімір Жытноў адкрыў **у лютым** сваю персанальную выставу «Мой край гераічны, мой край дарагі…» у Аршанскім этнаграфічным музеі «Млын».

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У Мастацкім музеі Віцебска **ў студзені** адкрылася персанальная выстава работ віцебскага скульптара Аляксандра Гвоздзікава пад назвай «Автопортрет в кругу друзей». У экспазіцыі прадстаўлены скульптурныя творы, фатаграфіі.

Пачынаючы віцебскі мастак Цімур Гарыпаў адкрыў сваю першую выставу «Сказки старого Востока» ў выставачнай зале Культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

У віцебскай дзіцячай школе мастацтваў № 3 «Маладзік» прайшоў абласны конкурс дзіцячай творчасці «Рождественские мотивы». Былі прадстаўлены звыш 270 малюнкаў і каля 50 прадметаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

22 студзеня былі падведзены вынікі конкурсу Minsk Fashion Day-2017. Гран-пры атрымала вядомы віцебскі дызайнер моды Марына Давыдава, якая прадставіла сваю вясенне-летнюю калекцыю ў намінацыі «Самая камерцыйная калекцыя». Таленавітая віцебская мастачка будзе прадстаўляць Беларусь у Італіі на Roma Fashion Week у красавіку.

24 студзеня ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстава «Маё жыццё ў мастацтве», прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння народнай артысткі Беларусі, вядучага майстра сцэны Коласаўскага тэатра Святланы Акружной. У экспазіцыі – работы мастакоў і фотамастакоў, скульптуры Валерыя Магучага.

Адкрыццём выставы «Герман Штрук. Марк Шагал. Графіка» ў Арт-цэнтры Марка Шагала быў дадзены старт мерапрыемствам, прысвечаным 130-годдзю з дня нараджэння М. Шагала. **25 студзеня** ў Арт-цэнтры прайшла прэзентацыя чацвёртага выпуску «Шагалаўскага зборніка», у які ўвайшлі матэрыялы XXIV і XXV Шагалаўскіх чытанняў за 2014–2015гады, у якіх удзельнічалі даследчыкі з Беларусі, Латвіі, Расіі, ЗША, Японіі.

У канцы **студзеня** ў Мастацкай галерэі Полацка адкрылася выстава работ членаў «Аб’яднання мастакоў Юрмалы» (Латвія). У

і Паўнамоцнага Пасла Індыі ў Рэспубліцы Беларусь Саксены Панкаджа. 9 лютага пасол Індыі пазнаёміўся з галоўнымі гістарычнымі і культурнымі славутасцямі абласнога цэнтра. На афіцыйнай сустрэчы дыпламата з намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама Алегам Мацкевічам і старшынёй Віцебскага гарвыканкама Віктарам Нікалайкіным абмяркоўваліся перспектывы развіцця супрацоўніцтва ў розных галінах. У сувязі з 25-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Індыяй рыхтуецца шэраг мерапрыемстваў у галіне культуры.

Дэлегацыя Чашніцкага раёна наведала Пыталаўскі раён Пскоўскай вобласці і прыняла ўдзел у святкаванні Масленіцы. На сустрэчы з кіраўніцтвам быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Адміністрацыяй Пыталаўскага раёна і Чашніцкім раённым Саветам дэпутатаў, прыняты план на 2017 год, які прадугледжвае сумесныя канцэрты самадзейных артыстаў, майстар-класы дамоў рамёстваў і інш. Чашніччане наведалі пасёлак Беларускі, дзе пазнаёміліся з дзейнасцю ўстаноў культуры. Адбыўся сумесны канцэрт ансамбля народнай музыкі і песні «Землякі» з Чашнік і творчага калектыву «Истоки» пасёлка Беларускі.

27–28 лютага Глыбоцкі раён наведала дэлегацыя Смаленскай вобласці ў складзе главы Муніцыпальнага ўтварэння Ярцаўскае гарадское пасяленне Ярцаўскага раёна Міхаіла Кулікова, старшыні Смаленскай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Сяргея Крыўко і намесніка галоўнага рэдактара газеты «Вести Приволья» Уладзіміра Лаўрэнава. У ходзе візіту быў падпісаны Пратакол намеру аб супрацоўніцтве паміж Муніцыпальным утварэннем Ярцаўскага гарадскога пасялення і Глыбоцкім раённым Саветам дэпутатаў. Згодна яго, абодва бакі ставяць перад сабой мэты наладжваць кантакты ў розных галінах, у тым ліку ў сферы культуры.

28 лютага ў г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці ў межах культурнага супрацоўніцтва паміж Віцебскай і Пскоўскай абласцямі адкрылася абменная выстава работ майстроў выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Народная творчасць Віцебшчыны». Выстава будзе працаваць да 17 сакавіка.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

7 студзеня ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» адбылося свята «Віцебскія калядкі». У памяшканнях комплексу былі арганізаваны інтэрактыўныя пляцоўкі, праходзілі паказальныя выступленні і майстар-класы клубаў гістарычнай рэканструкцыі «Нагльфар» і «Хальвіль». Працавала выстава народных рамёстваў «Кірмаш цудаў». Святочную атмасферу стваралі самадзейныя артысты, у тым ліку ансамблі гусляроў, народнай песні «Сябрына». У калядных гульнях прынялі ўдзел маскоўскія турысты.

Цікава і змястоўна прайшоў новы крэатыўны праект Багатырскага СДК Полацкага раёна пад назвай «Арт-уик-энд «Колядный разгуляй» **14 студзеня**. У праграме свята: шэсце «Калядны карнавал»; тэатралізаваны абрад «Сустрэча Каляды», у які былі ўключаны агледзіны нявест; флеш-эстафета «Снежны батл». У свяце прынялі ўдзел майстры Полацкага ЦРНК, якія арганізавалі выставу-продаж «Калядны кірмаш». Каманда аўтаклуба Полацкага РЦК забаўляла прысутных онлайн-гульнёй «Ах ты, зімушка-зіма». Работнікі Багатырскага СДК падрыхтавалі «Пачастункі ад Шчодрыка і Каляды». У правядзенні свята ўдзельнічалі творчыя калектывы Астроўшчынскага і Мацюшэўскага СДК, выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў Полацкага раёна, ваеннаслужачыя вайсковай часці № 25888. (*Полацкі веснік. – 2017. – 3 лют. – С. 17.)*

18 студзеня ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрылася выстава дзіцячай творчасці **«Цудоўны свет фарбаў»,** у якой прынялі ўдзел: узорная студыя выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Лепельскага раённага Дома культуры, узорная мастацкая студыя «Каларыт» Расонскай дзіцячай школы мастацтваў, народная студыя выяўленчага мастацтва Віцебскага абласнога Палаца дзяцей і моладзі, узорная студыя «Жывапіс» Наваполацкага гарадскога Дома культуры. У адкрыцці выставы

раённых музеях.

28 лютага ў г. Віцебску прайшлі ўрачыстасці з нагоды 100-гадовага юбілею беларускай міліцыі. Пачаліся яны з адкрыцця адзінага комплексу, які зберагае і прадаўжае традыцыі віцебскай міліцыі: музея і мемарыяльнага комплексу. Адбылося ўрачыстае адкрыццё абноўленай экспазіцыі музея УВД і рэканструяванага памятнага знака ў гонар загінуўшых пры выкананні службовага абавязку супрацоўнікаў міліцыі Віцебшчыны.

МАСТАЦТВА

Педагог дадатковай адукацыі Віцебскага абласнога Палаца дзяцей і моладзі, мастацкі кіраўнік узорнай вакальнай студыі «Ассоль» **Алена Фальковіч** удастоена ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2016». Яе выхаванцы неаднаразова перамагалі ў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях.

20 студзеня выкладчыкі і навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў № 3 г. Барані запрасілі аршанцаў на вялікі святочны канцэрт «Ключи к счастью» ў культурна-спартыўны цэнтр аршанскага Дома культуры чыгуначнікаў.

15 лютага ў Докшыцкай ДШМ было праведзена свята, прысвечанае Дню праваслаўнай моладзі. Праваслаўны свет адзначае гэты Дзень на Грамніцы з 1992 года. Малітоўнаму настрою сустрэчы садзейнічала цудоўная музыка і духоўныя вакальныя творы ў выкананні выкладчыкаў дзіцячай школы мастацтваў.

Напрыканцы лютага адбылося пасяджэнне Віцебскага гарвыканкама, на якім быў створаны гарадскі аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» на чале са старшынёй гарвыканкама Віктарам Нікалайкіным. (*Витьбичи. – 2017. – 28 февр. – С. 3.*)

«Судьба и Родина едины» – пад такой назвай **7–14 лютага** ў Расонскім музеі баявой садружнасці прайшоў Тыдзень памяці Пятра Міронавіча Машэрава. У праграме: выставы, экскурсіі, віктарыны. Тыдзень завяршыўся патрыятычным квэстам, ў якім прынялі ўдзел замежныя студэнты ВДУ імя П. М. Машэрава і супрацоўнікі Расонскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.

У Полацкім краязнаўчым музеі была праведзена вечарына памяці, прысвечаная Ганаровым грамадзянам горада Полацка, «Заслужаным настаўнікам БССР», «Выдатнікам асветы», удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, былым выкладчыкам Полацкага педвучылішча Мікалаю Мікалаевічу Пятрэнку і Пятру Купрыянавічу Пацэю. У мерапрыемстве прынялі ўдзел навучэнцы Полацкага каледжа УА «ВДУ імя П. М. Машэрава».

У Лёзненскім ваенна-гістарычным музеі да Дня выраду савецкіх войскаў з Афганістана адкрылася выстава графічных работ віцебскага мастака Г. П. Кісялёва пад назвай «Афганистан. Незабываемое».

У лютым было праведзена пасяджэнне Лепельскага райвыканкама, на якім былі разгледжаны пытанні практычнай рэалізацыі на тэрыторыі Лепельшчыны прававых нормаў Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь, што тычацца гісторыка-культурных каштоўнасцей.

«Первая мировая. Взгляд через столетие» – выстава пад такой назвай пачала працаваць **у лютым** у Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова. Аснову ўнікальнай экспазіцыі склала прыватная калекцыя мінчаніна Уладзіміра Багданава.

Да 20-годдзя Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея была падрыхтавана выстава «Рарытэты музеяў Дзісеншчыны», у якую ўвайшлі каштоўныя экспанаты чатырох музеяў: Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў, Міёрскага гісторыка-этнаграфічнага музея, Германавіцкага мастацка-этнаграфічнага музея імя Язэпа Драздовіча і Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея. **У лютым** выстава пачала працаваць у Глыбокім, затым плануецца паказ экспазіцыі ў Браслаўскім і Міёрскім

ўдзельнічалі мастацкія калектывы Віцебскага абласнога Палаца дзяцей і моладзі: вакальна-эстрадная студыя «Серпанцін» і калектыў эстраднага танца «Тэр-а-дэнс». Выстава працавала да 31 студзеня.

10 лютага ў Віцебскім АМЦНТ прайшоў абласны семінар для фалькларыстаў вобласці, вынікам якога стала выстава-прэзентацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. На сённяшні дзень у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны наступныя элементы Віцебскай вобласці: традыцыйная гульня «Жаніцьба Цярэшкі» ў Лепельскім раёне; традыцыя ажурнага ткацтва і масленічная абрадавая гульня «Пахаванне дзеда» ў Гарадоцкім раёне; традыцыйная тэхналогія выпечкі жытняга хлеба ў в. Дзеркаўшчына і абрад «Насіць намётку» ў в. Папшычы Глыбоцкага раёна; тэхналогія прыгатавання традыцыйнай стравы «Маслены баран» у в. Мацюкова Глыбоцкага раёна; традыцыя валення валёнак у Міёрскім раёне, традыцыйнае мастацтва малявання дываноў Віцебскага Паазер'я. 5 з гэтых элементаў былі прадстаўлены ў АМЦНТ перад фалькларыстамі вобласці. Праграма мерапрыемства ўключала майстар-клас па прыгатаванні святочнай стравы «Маслены баран», які правяла загадчык Мнюцкага СДК Марына Хрол.

10 лютага ў Віцебскім АМЦНТ адбылася творчая нарада дырэктараў РДК, ГЦК, ЦКС, Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў па асноўных пытаннях дзейнасці ўстаноў культуры клубнага тыпу ў 2017 годзе. Таксама былі праведзены кансультацыі па пытаннях інфарматызацыі ўстаноў культуры, ІБД і статыстыкі адміністратараў рэгіянальных баз даных.

26 лютага па ўсёй вобласці прайшлі святочныя гулянні з нагоды Масленіцы. Яны запомніліся песнямі, пералівамі гармонікаў і баянаў, цікавымі конкурсамі, праводзінамі Зімы і смачнымі блінамі. У абласным цэнтры масавыя мерапрыемствы былі арганізаваны на плошчы Перамогі, у комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі, у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, у ВДУ імя

П. М. Машэрава. Сотні віцебскіх сем'яў прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах у культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

КЛУБНАЯ СПРАВА

5 студзеня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбылося тэатралізаванае прадстаўленне «Прыехала Каляда!» для дзяцей з г. п. Шуміліна. Дзецям былі даспадобы і сустрэча з мядзведзем ды казой, з гаспадынямі, гульні, музыка і танцы, і частаванне каляднай ежай. Прадстаўленне «Прыехала Каляда!», арганізаванае спецыялістамі Віцебскага АМЦНТ, было знята абласным тэлебачаннем і паказана ў праграме «Вячэрні Віцебск» 9 студзеня.

Музычную казку «Алиса в Зазеркалье. Спасти Новый год!» прапанавалі юным гледачам у навагоднія святы самадзейныя артысты гарадскога Палаца культуры «Орша».

Аўтаклуб Полацкага раённага Цэнтра культуры з міні-канцэртам «Мы жадаем вам…» і гульнёвай праграмай «Ах ты, зімушка-зіма» наведаў многія вёскі раёна, фермы, бальніцы сястрынскага догляду, пабываў з віншаваннямі і падарункамі ў маламаёмасных і шматдзетных сем'ях. У святочнай праграме для сельскіх жыхароў бралі ўдзел калядны гурт Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, калядоўшчыкі з народнага фальклорнага калектыву «Галасы Спадчыны» Багатырскага СДК, артысты Блізніцкага філіяла дзіцячай школы мастацтваў Полацкага раёна.

Удзельнікі Лёзненскага народнага клуба «Ветэран» наладзілі ўшанаванне паважанага члена свайго калектыву – **Тамары Дзмітрыеўны Дзядковай**. Ветэран сістэмы адукацыі і культуры Лёзненшчыны, першая выканальніца славутай песні «Ручнікі» полацкага кампазітара Мікалая Пятрэнкі на словы Веры Вярбы адзначыла 80-годдзе.

Полацкі раённы Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур **10 студзеня** запрасіў гасцей на шоу-праграму Час цудаў, альбо Чароўны

Шумілінскім краязнаўчым музеі была арганізавана выстава «Журботныя фіялкі Халакоста».

Напрыканцы **студзеня** быў урачыста адкрыты музей гісторыі ААТ «Дубровенскі льнозавод».

Полацкі музей беларускага кнігадрукавання падрыхтаваў выставу «Служэнне роднаму слову», прымеркаваную да Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца **21 лютага**. Выстава прысвечана вядомым беларускім літаратарам і навукоўцам, якія плённа працавалі і працуюць на ніве нацыянальнага пісьменства і чые юбілеі прыпадаюць на 2017 год. У экспазіцыі выданні Цішкі Гартнага і Алеся Гаруна (130 гадоў з дня нараджэння), Пімена Панчанкі і Янкі Брыля (100 гадоў з дня нараджэння), Раісы Баравіковай і Алеся Разанава (70 гадоў з дня нараджэння) і многіх іншых. Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў музеі адбылася прэзентацыя культуралагічнага праекта «Францыск Скарына. Чалавек дасканалы». Удзел у мерапрыемстве прынялі начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Наталля Пшанічная, члены Маладзёжнага парламента г. Полацка, удзельнікі Рэспубліканскага форуму «Разам мы – Беларусь!» і члены Рэспубліканскага студэнцкага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь.

На пачатку **лютага** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Красота на каждый день». У экспазіцыі – звыш 600 прадметаў бытавога посуду і мастацкага шкла другой паловы XX стагоддзя з фондаў музея і прыватных калекцый. Выставу дапоўнілі графічныя і жывапісныя работы віцебскіх мастакоў Г. Шутава, Ф. Гумена, А. Мемуса, А. Каржанеўскага.

5 лютага ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адбылася вечарына памяці самадзейнага браслаўскага мастака Паўла Туманоўскага. Прысутныя пазнаёміліся з карцінамі мастака, пагляделі відэафільм пра яго, гаварылі пра неабходнасць усталявання помніка на магіле П. Туманоўскага.

За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, актыўную канцэртную, выставачную дзейнасць літаратурнаму аб'яднанню «Дняпроўскія галасы» Аршанскага музея У. С. Караткевіча прысвоена званне «народны» (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 3 ад 13.01. 2017 г.).

«Музей. Даритель. Экспонат» – выстава пад такой назвай экспанавалася на працягу **студзеня** ў Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі. У экспазіцыі прадстаўлены найбольш цікавыя экспанаты з тых, якія папоўнілі фонды музея ў 2016 годзе.

Пастаўскі раённы краязнаўчы музей **у студзені** запрасіў наведвальнікаў на выставу «Новогодняя ностальгия», прысвечаную 60–70 гадам мінулага стагоддзя. Экспазіцыя размясцілася ў выставачнай зале музея ў Палацы Тызенгаўзаў.

13 студзеня ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча адкрылася выстава «У свеце матацыклаў» з прыватнай калекцыі аршанца Валерыя Грачыса.

13 студзеня ў Міёрскім гісторыка-этнаграфічным музеі адкрылася выстава «Гораду Міёры – 45!». У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі, друкаваныя выданні, дакументы і іншыя экспанаты з фондаў музея. Выстаўлены кнігі мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, карціны земляка Вячаслава Шамшура і міярчанкі Тамары Масленік, экспанаты з уласных калекцый гісторыка Міхаіла Закрэўскага і краязнаўца Вітольда Ермалёнка. Падрыхтаваны расповед пра гісторыю Міёр ад першага ўпамінання ў 1514 годзе да нашых дзён.

20–31 студзеня ў Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі экспанавалася выстава «Жывая гісторыя газетных старонак», прымеркаваная да 85-гадовага юбілею раённай газеты «Герой працы».

27 студзеня, у Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста, супрацоўнікі Расонскага музея баявой садружнасці запрасілі вучняў Расонскай СШ на гістарычны альманах «Забвению не подлежат». У

куфар Дзеда Мароза». Сваёй творчасцю радавалі гледачоў музычны калектыў «Рунь», народны камерны духоўна-патрыятычны ансамбль «Спадчына», народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Полацкія россыпы», народныя клубы «Роднасць», «Майстар», «Рошва», гурткі дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 2 ад 13 студзеня 2017 г. народнаму клубу майстроў і самадзейных мастакоў «Вытокі» Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору прысвоена званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь». Траім майстрам: спіральнага пляцення і выцінанкі **Людміле Гаравой**, ткацтва **Марыне Гушчы**, лозапляцення **Васілю Сіманковічу** 26 снежня 2016 г. прысвоены статус «Народны майстар Рэспублікі Беларусь».

13 студзеня ў Лёзненскім раённым Цэнтры культуры прайшоў гала-канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці і аматарскіх аб'яднанняў са званнем «народны» «У творчасці няма межаў!». Народныя майстры размясцілі ў фае РЦК выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Згодна Пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 13 студзеня бягучага года жаночаму клубу «Залаты ўзрост» Мазалаўскага СДК прысвоена ганаровае званне «Народны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

13 студзеня ў Сенненскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці быў арганізаваны калядны канцэрт. Наведвальнікаў сустракалі калядоўшчыкі з ліку ўдзельнікаў фальклорных калектываў. У якасці варажбітоў выступілі майстры раённага Дома рамёстваў, якія прадставілі свае сувеніры на выставе-кірмашы. Прадстаўленне народнага лялечнага тэатра паказалі дзеці з гуртка «Сенненская батлейка», створанага пры раённым Доме рамёстваў. Перад сабраўшымися выступіў благачынны Сенненскай акругі, протаіерэй Свята-Мікалаеўскай царквы Мікалай Валачковіч. У святочным канцэрце прынялі ўдзел выкладчыкі і навучэнцы Сенненскай, Багушэўскай і Машканскай дзіцячых школ мастацтваў.

Напярэдадні старога Новага года ў фае Докшыцкай кіна-

канцэртнай залы «Іскра» адбыўся першы гарадскі баль «Чароўны навагодні вечар», праведзены з улікам тэндэнцый XIX стагоддзя. Асаблівы каларыт прыдавала гэтаму свецкаму балю класічная музыка ў выкананні педагогаў і навучэнцаў Докшыцкай ДШМ.

15 студзеня ў Докшыцкім гарадскім Цэнтры культуры адбылася калядная сустрэча «Свет каляднай зоркі» з літаратурнай гасцёўняй духоўна-асветніцкай газеты «Воскресение». Трэці год запар сталічныя госці прыязджаюць у раён і дзеляцца сваёй творчасцю.

Вялікім святочным канцэртам адзначыў 30-гадовы юбілей Палац культуры г. п. Руба. У юбілейнай праграме ўдзельнічала большасць калектываў і салістаў культасветустановы. Павіншаваць калектыў і ўручыць ганаровыя граматы прыбылі прадстаўнікі Віцебскага аблвыканкама і Віцебскага гарвыканкама. Асабліва адзначана была творчая і дзелавая энергія нязменнага дырэктара Палаца культуры **Ларысы Зволінскай**. Свае творчыя падарункі прывезлі юбілярам студыя «Вікторыя» ВДТУ і даўнія сябры – ансамбль «Тараторки» з Бранска.

25 студзеня ў ВАМЦНТ была арганізавана забаўляльная праграма да Дня студэнта, на якую былі запрошаны замежныя студэнты з ВДАВМ. Удзельнікі творчых калектываў Воранаўскага і Капцянскага СДК Віцебскага раёна сваім выступленнем парадавалі прысутных.

27 студзеня на сцэне Палаца культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» адбыўся вялікі канцэрт творчых калектываў Полацкага гарадскога Палаца культуры «Свет нашых захапленняў» па выніках Года культуры.

27 студзеня на сцэне Верхнядзвінскага раённага Дома культуры адбылося святкаванне 20-гадовага юбілею народнага вакальна-харэаграфічнага калектыву «Ярыца». У канцэртнай праграме выступілі і юбіляры, і наступныя калектывы: народны ансамбль «Верхнядзвінскія музыкі», ВІА «Драйв», эстрадная група «Праект», народны клуб «Ветэран» і ансамбль лыжкароў «Забава», народны вакальны калектыў «Дзвінскія напевы».

таямніцы», дзе прадстаўлены не толькі кнігі, даведачныя і энцыклапедычныя выданні, у якіх распавядаецца пра гісторыю навукі, вялікія вынаходкі і адкрыцці, але і рэчы, якія штодзённа знаходзяцца вакол нас.

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Напярэдадні калядных святаў у Лужкаўскай бібліятэцы-філіяле № 29 прайшлі калядныя чытанні «В сиянии Рождественской звезды», падчас якіх юныя чытачы змаглі далучыцца да народных традыцый і звычаяў, звязаных з Раством Хрыстовым.

11 студзеня ў Пялікаўскай бібліятэцы-філіяле № 35 адбылася гульня-віктарына «Под зонтиком добра». Падчас мерапрыемства юныя чытачы называлі ветлівыя словы, адгадвалі загадкі, вучыліся правільна выходзіць з нестандартных сітуацый.

12 студзеня бібліятэкар Навасёлкаўскай бібліятэкі-філіяла № 32 правяла гутарку «Праклаўшы шлях да зор», прымеркаваную да 110-годдзя з дня нараджэння заснавальніка савецкай касманаўтыкі С. П. Каралёва.

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

25 студзеня ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі прайшло тэатралізаванае прадстаўленне «Пасвячэнне ў чытачы» для вучняў 3 «А» класа СШ № 1.

28 студзеня ў чытальнай зале раённай бібліятэкі адбылася тэматычная сустрэча «Нобелевские лауреаты с белорусскими корнями» да Дня беларускай навукі. На мерапрыемства была запрошаны вучні старэйшых класаў СШ № 2.

21 лютага ў бібліятэцы «Дабееўскі мох» з вучнямі 6 класа СШ № 2 была праведзена конкурс-гульня «Любі, шануй, ведай роднае слова».

23 лютага ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі прайшоў рыцарскі турнір «Богатырские забавы» да дня Абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

2 лютага Пастаўская раённая бібліятэка правяла юбілейнае пасяджэнне клуба па інтарэсах «Сучаснікі», прысвечанае 10-годдзю з дня заснавання клуба. На пасяджэнне прыйшлі ўдзельнікі клуба, супрацоўнікі, у якасці ганаровых гасцей прысутнічалі паэт, краязнаўца, настаўнік геаграфіі І. М. Пракаповіч, паэт У. М. Свірковіч, музыкант, кіраўнік музычнага гурта «Скіфы» В. А. Верацельнікаў.

21 лютага Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі правяла акцыю «21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы», прысвечаную беларускай мове. У акцыі браў удзел літаральна кожны чытач, хто ў гэты дзень наведваўся ў бібліятэку.

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У Вялікадолецкай бібліятэцы-філіяле № 4 праведзена гадзіна чытанняў «Время волшебства». Дзеці пазнаёміліся з вершамі, апавяданнямі і казкамі пра зіму і Новы год. Асабліва спадабаліся ім героі кніг «Казачка пра гандляра Пятра, Казу і Каляды» І. Кузьмініча і «Каляды з хроснай: праўдзівыя гісторыі і крышачку чарадзейства» А. Масла.

У дзіцячай бібліятэцы была праведзена літаратурная гульня «Винни Пух идет к нам в гости». Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з біяграфіяй аўтара кнігі Алана Мілна і гісторыяй стварэння персанажа Вінні-Пуха.

У Плінскай бібліятэцы прайшла гадзіна роднай мовы «Родная мова – цудадзейная крыніца». У гэты дзень гучалі вершы П. Панчанкі, У. Дубоўкі, М. Танка, С. Грахоўскага і інш.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У сувязі з абвяшчэннем 2017 года Годам навукі Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка запрасіла **ў студзені** ўсіх жадаючых на гістарычную пазл-гульню «Гісторыя звычайных рэчаў». Да мерапрыемства была аформлена выстава-інсталяцыя «Навука адкрывае

28 студзеня стартаваў новы праект «Парад творчых сем'яў» у Доме культуры аграгарадка Дабрамыслі Лёзненскага раёна. У першым туры сваю творчасць прадставіла сям'я дырэктара ДК Аляксея Міхайлавіча Агеева.

«З песняй у душы» – пад такой назвай **29 студзеня** ў Пастаўскім раённым Доме культуры па вуліцы Станкевіча ў рамках творчага праекта «Вечар разам» адбыўся сольны канцэрт вядомага на Пастаўшчыне вакаліста і музыканта Пятра Караля, саліста папулярнай эстраднай групы «25 плюс-мінус».

У студзені ў Глыбоцкім раённым Доме рамёстваў адкрылася выстава «Творым ад сэрца і душы». У экспазіцыі прадстаўлены творы інсітнага мастацтва (малюнкі, скульптура) самадзейных мастачак Францішкі Станкевіч і Алы Арцімовіч з Глыбоччыны.

Тэатральны сезон-2017 народны тэатр «Время» Наваполацкага Цэнтра культуры адкрыў прэм'ерай спектакля па п'есе Марыі Ладо «Вельмі простая гісторыя».

У Богінскім сельскім клубе Браслаўскага раёна была праведзена фальклорная вечарына «Беларускі каляндар у гліняным гаршчочку». Пачалося дзеянне са святкавання Калядаў, якое суправаджалася песнямі і гульнямі маленькіх калядоўшчыкаў. Моладзь у нацыянальных строях разыграла старажытную гульню «Жаніцьба Цярэшкі».

Народны клуб кветкаводаў-аматараў Цэнтра культуры «Віцебск» адзначыў 30-гадовы юбілей. Урачыстасці прайшлі ў Канцэртнай зале «Віцебск». Юбіляраў віншавалі начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталля Шыянок, аднадумцы з Гарадоцкага народнага клуба «Зялёная альтанка» і шматлікія прыхільнікі творчасці ўдзельнікаў клуба, для якіх была арганізавана выстава фларыстыкі «Зімовы букет».

У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» адкрылася выстава «Дванаццаць месяцаў», якая распачала цыкл мерапрыемстваў да 70-годдзя старэйшага ў вобласці

народнага клуба самадзейных мастакоў «Контур» (г. Віцебск).

2 лютага ў Глыбоцкім Цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці адкрылася выстава «Вялікае маленькае жыццё». Аўтар – дырэктар Глыбоцкага Дома рамёстваў, народны майстар Беларусі Святлана Скавырка. У экспазіцыі – маляваныя дываны і карціны.

7 лютага ў Дубровенскім раённым Доме культуры адбылася тэматычная вечарына, арганізаваная народным клубам нацыянальнай кухні і беларускай гульні «Дубровенскія прысмакі» і прысвечаная пірагам.

10 лютага ў Юнькаўскім СДК Пастаўскага раёна прайшоў традыцыйны зімовы «Шляхецкі баль», які сабраў моладзь з усяго раёна.

12 лютага ў Дрысвяцкім СДК Браслаўскага раёна адбылася прэм'ера спектакля па п'есе «Паданне пра панскі маёнтак Ямполле, альбо Пасаг набожчыцы», якую напісала вядомая дрысвяцкая краязнаўца Эмілія Шавэла паводле мясцовага падання. Пастаноўку ажыццявілі ўдзельнікі тэатра «Лявоніха» і народнага фальклорнага гурта «Вярба».

У Каўшэлеўскім Доме фальклору Шаркаўшчынскага раёна па ініцыятыве яго загадчыцы Надзеі Вайцюль **у лютым** было праведзена мерапрыемства да Міжнароднага дня роднай мовы. У мерапрыемстве ўдзельнічалі члены народнага літаратурна-музычнага аб'яднання «Світанак» пры Шаркаўшчынскім раённым цэнтры культуры, вучні Більдзюжскай і Новапагосцкай (Міёрскі раён) сярэдніх школ. Яркім дапаўненнем да свята стала выступленне народнага фальклорнага гурта «Купалінка» і гурта «Шчадроты» Каўшэлеўскага Дома фальклору. Самадзейныя артысты Жукоўшчынскага сельскага клуба прадэманстравалі пастаноўку «Конскі партрэт» па п'есе Л. Родзевіча.

У лютым у Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Таленавіты кожны чалавек» – творчая справаздача народнага клуба майстроў «Натхненне» Сенненскага раённага Дома рамёстваў.

20 лютага ў в. Даўгаполле Гарадоцкага раёна праведзена традыцыйная абрадавая гульня «Пахаванне Дзеда». З 2013 года гэта традыцыйная масленічная гульня з'яўляецца аб'ектам нематэрыяльнай

інтэрнацыяналістаў.

22 лютага ў бібліятэцы імя Янкі Купалы ў межах праграмы «Мой город – Родины частица» для вучняў СШ № 8 і СШ № 6 г. Полацка была праведзена гадзіна выдатнай асобы «Хросны бацька кнігадрукавання» з цыкла мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

5 студзеня работнікі Сенненскай ДРБ арганізавалі забаўляльную праграму для школьнікаў «В гостях у зимушки», у Багушэўскай гарпасялковай бібліятэцы прайшла літаратурная гульня «Не прожить на белом свете без любимых книжек детям».

27 студзеня ў зале Сенненскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным падвядзенню вынікаў Года культуры, з творчай справаздачай выступілі супрацоўнікі Сенненской ЦРБ. У фае Дома культуры былі оформлены выставы: «Наши достижения», «Сенненшчына мая сінявокая», «Творческий калейдоскоп».

13 лютага работнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з Сенненскім райкамам Кампартыі Беларусі правялі гадзіну памяці і славы «Сын беларускай зямлі», прысвечаную 99-годдзю з дня нараджэння П. М. Машэрава. Мерапрыемства прайшло ў памяшканні Сенненскай дзіцячай школы мастацтваў. На яго былі запрошаны прадстаўнікі ўлады, грамадскіх аб'яднанняў, маладое пакаленне. Да гадавіны з дня нараджэння слыннага земляка была афармлена кніжная выстава «У сэрцы ўдзячных патомкаў».

.

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

13 студзеня ў рамках пасяджэння жаночага клуба «Сяброўка» пры Лынтупскай гарпасялковай бібліятэцы было праведзена свята «Снежная-нежная сказка зимы», прысвечанае святкаванню Старога Новага года.

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

5 студзеня ў бібліятэцы-філіяле № 2 імя А. Герцэна сумесна з Дзіцячым музеем была арганізавана навагодняя літаратурная забаўка. Навуковы супрацоўнік музея Юлія Качарагіна пазнаёміла дзяцей з дзіцячымі часопісамі 19 стагоддзя з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, падрыхтавала іх агляд, правяла розныя гульні, віктарыны, забавы.

12 студзеня ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылася сустрэча «Святые дни Рождества» ў рамках літаратурна-музычнай гасцёўні «Под сенью духовности». У актавай зале бібліятэкі сабраліся чытачы, жыхары мікрараёна, прыхаджане праваслаўных храмаў. Настаяцель храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы протаіерэй Уладзімір Рацьковіч павіншаваў прысутных са святам Нараджэння Хрыстова. У канцэртнай праграме прыняў удзел царкоўны хор храма.

16 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбыўся даверны дыялог «Святло нябеснага цуду» паміж вучнямі гімназіі № 1 і іерэем Богаяўленскага сабора айцом Маркам.

19 студзеня ў бібліятэцы імя Я. Купалы для вучняў 10 класа Полацкага кадэцкага вучылішча была падрыхтавана духоўна-асветніцкая гутарка «Святы Ян Хрысціцель». У гэты ж дзень у межах праграмы «Мой город – Родины частица» для вучняў СШ № 6 быў праведзены вусны часопіс «Кніга і кніжнасць у Полацку» з цыкла мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

13 лютага ў бібліятэцы імя Янкі Купалы адбыўся творчы вечар «Шукаю душы сваёй радасць», падрыхтаваны для членаў Полацкай аб'яднанай арганізацыі «Беларускае таварыства інвалідаў». Госці бібліятэкі пазнаёміліся з творчасцю ўдзельніцы Наваполацкага народнага літаратурна-музычнага калектыву «Крылы» Ганны Алескеравай.

У бібліятэцы-філіяле № 2 імя Герцэна адбылася гадзіна памяці «Есть в феврале особенная дата» да Дня памяці воінаў-

гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь і захоўваецца, дзякуючы жыхарам вёскі і работнікам Даўгапольскага СДК.

Да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у Чашніцкім ГДК быў праведзены ўрачысты вечар «Мы вам судьбу Отчизны доверяем».

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Узорная музычная студыя «Альтанка» Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі атрымала спецыяльны прыз за прафесіяналізм і творчасць і 12 дыпломаў у розных сольных і ансамблевых вакальных намінацыях на X Міжнародным фестывалі «Калейдаскоп талентаў. Зіма-2017», які адбыўся **ў пачатку студзеня** ў польскім горадзе Паляніца Здруй.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца «Прэм'ер-Спонайд» Палаца культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» заваяваў Гран-пры на Міжнародным калядным фестывалі ў Фінляндыі, у якім ўдзельнічалі таксама калектывы з Расіі, Украіны, Фінляндыі, Эстоніі.

5 студзеня ў рамках XV фестывалю «Дні хрысціянскай культуры» ў Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Чыгуначнага раёна Віцебска прайшоў дыяцэзіяльны конкурс калядных батлеек. Удзел у ім прынялі 13 калектываў з парафій Віцебскай вобласці. Першае месца было прысуджана калектыву віцебскай парафіі Езуса Міласэрнага.

13–22 студзеня ў Оршы па блаславенні архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзімітрыя і пры падтрымцы Аршанскага райвыканкама прайшоў фестываль праваслаўнай культуры «Кладезь». Арганізатар – Свята-Елісавецінскі манастыр (Мінск). У праграме: духоўна-асветніцкія сустрэчы, выстава-кірмаш вырабаў манастырскіх майстэрняў, прадстаўленні лялечнага тэатра «Батлейка», мерапрыемствы ў школах, Аршанскай ЦБ імя А. С. Пушкіна, Аршанскім ГЦК «Победа».

У г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна адбыўся IX раённы хрысціянскі фестываль «Калядная зорка». Арганізатары – Асвейская

дзіцячая школа мастацтваў і Асвейская Царква Хрысціян Веры Евангельскай «Благодать». У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі розных канфесій Верхнядзвіншчыны. Перад прысутнымі выступілі намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Верхнядзвінскага райвыканкама Н. Кісялевіч, вядомы ў раёне паэт, гісторык, этнограф А. Бубала. Музычнымі нумарамі парадавалі выкладчыкі і навучэнцы Асвейскай ДШМ.

9 студзеня ў Палацы культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» прайшоў адкрыты раённы конкурс праваслаўнай літаратурна-музычнай творчасці «Благавест над Полацкам», **12 студзеня** адбылося ўзнагароджанне фіналістаў конкурсу, якія прынялі ўдзел у святочным гала-канцэрце.

На V Міжнародным фестывалі наіўнага мастацтва і творчасці аўтсайдараў «ФЕСТНАИВ-2016» у Маскве Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці былі прадстаўлены творы 12 аўтараў з Віцебскай вобласці. Арганізатар фестывалю – Музей рускага лубка і наіўнага мастацтва. У выніковую выставу «Сотворение мира» ў музеі сучаснага мастацтва на Пятроўцы (з 2 лютага па 17 красавіка) ўключаны работы Часлава Жуселя, Ірыны Церашковай, Тамары Сяднёвай, Віктара Яршова, Сяргея Міхайліка, Святланы Мішурнай, Маргарыты Сайфугалієвай, Антаніны Маісеевай і іншых.

15 і 17 лютага ў г. п. Лёзна і г. п. Расоны прайшлі занальныя туры абласнога конкурсу патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў», у якіх прынялі ўдзел больш за 70 выканаўцаў: салісты, дуэты і ансамблі. У фінал, які пройдзе ў Оршы 14 сакавіка, прайшлі прадстаўнікі г. Віцебска, г. Наваполацка, а таксама Віцебскага, Сенненскага, Дубровенскага, Чашніцкага, Аршанскага, Гарадоцкага, Полацкага, Верхнядзвінскага, Пастаўскага, Глыбоцкага і Расонскага раёнаў. Падчас адборачных тураў прайшоў і конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні ў межах XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017». Пераможцамі сталі: Юля Латковіч, Вольга Мазго з Віцебска, Юля Кудлакова з Оршы.

пасяджэння маладзёжнага клуба «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

21 лютага да Міжнароднага дня роднай мовы ў ЦРБ арганізавалі вечар-сустрэчу ўдзельнікаў народнага літаратурна-музычнага клуба «Выток» (г. Лепель) і народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» (г. Полацк).

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

17 студзеня ў раённай бібліятэцы адбылася сустрэча з іерэем Расціславам Страхой «Пока души не высушен родник», прысвечаная праваслаўнаму святу Хрышчэння або Богаяўлення. Госці пазнаёміліся з гісторыяй і асаблівасцямі свята, пачулі пра розныя старадаўнія звычаі, удзельнічалі ў віктарыне, даведаліся пра народныя прыкметы, звязаныя з гэтай з'явай.

27 студзеня ў літаратурным кафэ «Пад абажурам» чытачам была прапанавана літаратурна-музычная кампазіцыя «Говорили и пели стихами», прысвечаная юбілейным датам двух выдатных паэтак эпохі «шасцідзясятнікаў» Рымы Казаковай і Бэлы Ахмадулінай.

6 лютага аддзел па рабоце з дзецьмі раённай бібліятэкі правёў мерапрыемства ў форме літаратурнага паслання «И Пушкинской дороге нет конца», прысвечанае 180-годдзю з дня гібелі паэта.

18 лютага ў Барсееўскай сельскай бібліятэцы адбылася вечарына-партрэт «Народжаная пад знакам паэзіі», прысвечаная беларускай паэтэсе Веры Вярбе.

22 лютага ў літаратурнай кавярні раённай бібліятэкі адбылося адкрыццё выставы віцебскага мастака С.М. Акулёнка «Гульня фарбаў».

ДУК «Міёрская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

14 лютага 15-гадовы юбілей адсвяткаваў клуб «Бажэна», створаны пры Міёрскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 студзеня ў Валкалацкай сельскай бібліятэцы прайшоў літаратурны вечар да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Васіля Гігевіча «На мяжы імгнення і вечнасці».

7 студзеня супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі арганізавалі калядны ранішнік «Зимней сказкой наступает Рождество Христово».

У Докшыцкай цэнтральнай бібліятэцы **19 студзеня** прайшла тэматычная гадзіна «Раз в Крещенский вечерок», **25 студзеня –** святочны вечар «Итак, она звалась Татьяной…».

20 студзеня работнікі Бягомльскай гарпасялковай бібліятэкі правялі патрыятычную гадзіну «Дети военных лет».

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

24 студзеня ў Дубровенскай ЦРБ праведзена гадзіна цікавай інфармацыі «Дубровеншчына: вехі гісторыі» (да 245-годдзя з дня ўключэння Дубровеншчыны ў склад Расійскай імперыі). Мерапрыемства, на якое былі запрошаны супрацоўнікі рэдакцыі раённай газеты «Дняпроўская праўда», уключала агляд літаратуры і дэманстрацыю дакументальнага фільма.

23 лютага ў ЦРБ быў праведзены тэматычны вечар «Афган прайшоў па нашых душах» у рамках адкрытага пасяджэння клуба «Любопытно. Интересно. Увлекательно».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У студзені ў раённай бібліятэцы былі праведзены агляд літаратуры «Займальны свет рукадзелля» на пасяджэнні клуба «Мастерица» і мерапрыемства «500 год з кнігай Скарыны»; у дзіцячай бібліятэцы – выстава-падарожжа «Шляхам Скарыны» і літаратурная гульня «Винни-Пух и все-все-все».

13 лютага ў ЦРБ была праведзена гадзіна інфармацыі, прысвечаная прафесіям сельскагаспадарчага профілю, у рамках

18 лютага на лыжаролернай трасе ў Гарадку адбылося абласное спартыўна-мастацкае свята «Віцебская лыжня-2017», якое сабрала аматараў актыўнага адпачынку. Свята ўключала канцэртную праграму з удзелам творчых калектываў устаноў культуры Гарадоцкага, Віцебскага, Шумілінскага раёнаў і г. Віцебска. Цікавымі і насычанымі былі прэзентацыі клубаў нацыянальнай кухні, сярод якіх – народны клуб аматараў беларускай нацыянальнай кухні, фальклору і гульні «Бараболя» Вярхоўскага СДК Бешанковіцкага раёна; народнае аматарскае аб’яднанне «Хозяюшка» Кабішчанскага СДК Гарадоцкага раёна; жаночы клуб «Сударушка» Сяляўшчынскага СДК Расонскага раёна, народны клуб аматараў беларускай кухні «Смак» з Чашніцкага раёна і іншыя. Упрыгожваннем свята сталі выставы і майстар-класы ад майстроў Дамоў і Цэнтраў рамёстваў Віцебшчыны. Не абышлося і без гульнёвых праграм. У межах свята адбыўся конкурс майстэрства культарганізатараў «Пачынай з зарадкі кожны дзень», удзел у якім прынялі прадстаўнікі з дзесяці раёнаў вобласці.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

4 студзеня адбылася літаратурна-музычная імпрэза, прысвечаная святу Божага Нараджэння. Гасцямі вечарыны сталі Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч, канцлер дыяцэзіяльнай курыі ксёндз Віктар Місевіч, вернікі розных канфесій, літаратары, удзельнікі аматарскіх творчых суполак горада.

5 студзеня аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі была арганізавана літаратурная імпрэза Алега Сяшко і Алены Крыклівец «Соприкасание: поэтический диалог».

12 студзеня ў аддзеле літаратуры па мастацтве прайшло пасяджэнне метадычнага аб'яднання настаўнікаў музыкі агульнаадукацыйных школ Першамайскага раёна г. Віцебска «Сучасныя тэхналогіі выкладання вучэбнага прадмета «Музыка» як сродак духоўна-

маральнага выхавання і развіцця творчага патэнцыялу навучэнцаў». Супрацоўнікі аддзела літаратуры па мастацтве прадставілі інфармацыйныя рэсурсы аддзела, правялі экскурсію па бібліятэцы.

19 студзеня ў бібліятэцы была праведзена прэзентацыя кнігі кандыдата гістарычных навук Мікалая Півавара «50 музеев Витебска».

19 студзеня адбылася прэзентацыя кнігі Тамары Красновай-Гусачэнкі «Жизнь – моя молитва». Тамара Краснова-Гусачэнка – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюза пісьменнікаў Расіі, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар больш чым дваццаці кніг, сярод якіх вершы і казкі для дзяцей, паэтычныя зборнікі. Кніга «Жизнь – моя молитва» – гэта першая кніга прозы аўтара.

Супрацоўнікі электроннай чытальнай залы да Дня беларускай навукі падрыхтавалі онлайн-выставу, на якой прадстаўлены навуковыя і навукова-папулярныя перыядычныя выданні, якія выпускаюцца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі як вынік навуковай дзейнасці вучоных і спецыялістаў Рэспублікі Беларусь.

25 студзеня ў аддзеле перыядычных выданняў у рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» адбыўся майстар-клас па тэхніцы халоднага фарфору «Кветкавыя фантазіі» для людзей пажылога ўзросту і інвалідаў па зроку. Сакрэтамі свайго майстэрства падзялілася мастак-аматар Святлана Старынская.

26 студзеня ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Пад вобразам Спаса: рэлігійнае жыццё Віцебска ў XIV – пачатку XVIII стст.».

25, 26, 30 і 31 студзеня ў рамках бібліятэчнага праекта «Літаратурныя ўрокі для школьнікаў: новы фармат» для вучняў малодшых класаў сярэдніх школ № 6, 22, 23, 27, 45 супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры правялі тэатралізаваныя ўрокі, прысвечаныя творчасці Льюіса Кэрала «З Алісай па Краіне Цудаў».

новые имена».

У дзіцячай бібліятэцы **19–20 студзеня** праходзіла літаратурная гульня для розных груп чытачоў «Кто ходит в гости по утрам?» па творчасці А. Мілна.

15 лютага ў ЦРБ быў праведзены ўрок прафарыентацыі «Профессия библиотекарь: проверено на себе»; **21 лютага** праходзіла акцыя «Моўны дзень у бібліятэцы», да якой была афармлена кніжная выстава «Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова».

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У межах святкавання Міжнароднага дня роднай мовы ў цэнтральнай раённай бібліятэцы была наладжана вечарына «Слаўлю цябе, беларуская мова, слаўлю цябе, беларускі народ». Удзельнічалі вучні 8 класа гімназіі № 6 г. Віцебска.

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

27 студзеня ўдзельнікі клуба «Ключ», які працуе пры аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі, сустрэліся на чарговым пасяджэнні «Наш дом – Земля». У гэты ж дзень адбылася чарговая сустрэча ўдзельнікаў клуба «Сверстник», якія былі запрошаны на ўрок этыкету «Пытанні маркіза Этыкету».

14 лютага ў літаратурна-музычнай гасцёўні культурна-асветніцкага цэнтра «Гарадок» адбылася сустрэча ўдзельнікаў клуба «Сверстник» са старшынёй Гарадоцкай раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» В. Б. Камышовым. Урок мужнасці «Незабытыя героі неаб'яўленай вайны» быў арганізаваны работнікамі бібліятэкі сумесна з супрацоўнікамі раённага краязнаўчага музея.

Гасцямі і ўдзельнікамі мерапрыемства былі студэнты УА «Наваполацкі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў».

30 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака адбылася прэзентацыя альманаха «Наддзвінне», прысвечанага 90-годдзю полацкага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне».

Бібліятэка імя Я.Коласа распрацавала новы літаратурна-выставачны праект «Назад в СССР», які накіраваны на адраджэнне і захаванне гістарычнай памяці пакаленняў. **9 лютага** праект стартаваў з вечара настальгіі «Назад в СССР».

ЦБ імя Маякоўскага працягвала работу па праекце «Дотянуться до звёзд Новополацка». **15 лютага** адбылася прэзентацыя кнігі «Яркий след на земле и воде», прысвечанай 50-годдзю вадналыжнай школы г. Наваполацка, і сустрэча з маладымі выхаванцамі СДЮШАР імя Н. Л. Генова І. Лабковічам, К. Кісялёвай і К. Лапкоўскім – пераможцамі шматлікіх міжнародных спаборніцтваў.

Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна працягвалі здзяйсняць праект «Чытай са мной па-беларуску».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

13–22 лютага ў Браслаўскай цэнтральнай бібліятэцы праведзена дэкада папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры «Як жыта спрадвечная беларуская мова!»

23 лютага ў ЦБ праведзена пасяджэнне круглага стала на тэму «Практыка работы публічных бібліятэк Браслаўскага раёна ў рамках Года культуры: формы работы, творчы вопыт».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

У цэнтральнай раённай бібліятэцы **2 студзеня** была праведзена акцыя «Першы чытач», **18 студзеня** – Дзень інфармацыі «Новые книги –

1 лютага адбылося адкрыццё выставы вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свет маіх захапленняў» з асабістай калекцыі бібліятэкара Віцебскай абласной бібліятэкі Марыны Матвеевай.

2 лютага ў рамках цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы» адбылася сустрэча з краязнаўцам, фатографам, мастаком Віктарам Барысенкавым «Храмы Віцебска: страчаная спадчына».

6 лютага ў бібліятэцы адбылося адкрыццё выставы графічных работ выпускнікоў мастацкага аддзялення ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў № 3 г. Віцебска «Маладзік», (настаўнік – Ігар Дураў). Мерапрыемства прайшло ў рамках бібліятэчнага праекта «Адлюстраванне».

8 лютага ў рамках праекта «Бібліятэка – зона моўнага пагружэння» ў сектары замежнай літаратуры на англійскай мове праведзена інтэлектуальная гульня «Няхай светам кіруе каханне». Мерапрыемства было прымеркавана да Дня Святога Валянціна. З асаблівасцямі гэтага свята, яго знакамі і легендамі былі звязаны пытанні гульні, якая праходзіла ў тры туры.

9 лютага ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Віцебск у ваенных падзеях XIV – XVIII стст.».

16 і 20 лютага ў бібліятэцы ў рамках бібліятэчнага праекта «Літаратурныя ўрокі для школьнікаў: новы фармат» для вучняў старэйшых класаў гімназій № 5, 8, 9 і СШ № 33 г. Віцебска супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы былі праведзены літаратурныя ўрокі, прысвечаныя памяці А. С. Пушкіна «И с каждой осенью я расцветаю вновь...».

22 лютага ў агульнай чытальнай зале сумесна з Віцебскай абласной арганізацыяй ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны» праведзена «Свята роднай мовы», прымеркаванае да Міжнароднага дня роднай мовы. Старшыня абласной арганізацыі ТБМ Юрый Бабіч правёў агульную дыктоўку паводле твора Янкі Брыля

«Усмешка». Прагучалі вершы і песні беларускіх аўтараў.

23 лютага праведзены чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Віцебск як адміністрацыйны цэнтр Расійскай імперыі».

25 лютага ў рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» у аддзеле перыядычных выданняў прайшла інфармацыйная гадзіна «Непрапісныя ісціны выхавання Сымона Салавейчыка» для бацькоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і іх дзяцей з групы самадапамогі «ОАЗИС».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

13 студзеня на святочную праграму «Усмешкі зімы», прысвечаную Старому Новаму году, сваіх чытачоў – былых супрацоўнікаў і людзей сталага ўзросту – запрасіла бібліятэка імя У. Караткевіча. Музычную праграму прадставіў сямейны музычны клуб «Арыён» (мастацкі кіраўнік Надзея Несцярэнка).

У межах праекта «Духоўна-асветніцкія сустрэчы» ў бібліятэцы імя Еўфрасінні Полацкай **19 студзеня** адбылася вечарына «Чыстае свята Хрышчэння Гасподня», на якой прысутнічалі чытачы і айцец Андрэй (Смольскі), настаяцель храма Праабражэння Гасподня, старшыня аддзела рэлігійнай адукацыі пры Віцебскай епархіі.

У бібліятэцы імя С. Маршака для навучэнцаў 9-х класаў віцебскай СШ № 4 **23 студзеня** праведзена гадзіна памяці «Нам жыць і помніць», прысвечаная 73-й гадавіне зняцця блакады Ленінграда.

24 студзеня віцебскі калекцыянер Наталля Кавалёва прадставіла ў бібліятэцы імя Я. Коласа выставу «Гісторыя ёлачных цацак».

«Художник полудня Иван Шишкин» – мультымедыйная прэзентацыя, прысвечаная 185-годдзю з дня нараджэння вядомага рускага пейзажыста, адбылася ў ЦГБ імя М. Горкага **25 студзеня**. Прысутнічалі члены гарадскога клуба «Залаты ўзрост» і навучэнцы УА «Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж машынабудавання імя

М. Шмырова». У выкананні актрысы тэатра імя Я. Коласа Святланы Жукоўскай прагучалі музычныя кампазіцыі і вершы.

9 лютага ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася мультымедыйная прэзентацыя «Любоў Арлова – мегазорка савецкага экрана» да 115-гадовага юбілею народнай артысткі СССР.

11 лютага ЦГБ імя М. Горкага запрасіла чытачоў на вечарыну-прысвячэнне «Напалеон Орда – шлях да Бацькаўшчыны», прысвечаную 210-годдзю з дня нараджэння знакамітага мастака, кампазітара, піяніста, пісьменніка.

На гадзіну мужнасці «Афганістан – наша памяць і боль» у цэнтральную бібліятэку былі запрошаны супрацоўнікі Віцебскага гарадскога музея воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія расказалі прысутным пра падзеі афганскай вайны і прадэманстравалі дакументальны фільм «Война где-то рядом».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

15 студзеня ў рамках праекта «Жывое слова духоўнай мудрасці» ў ЦБ імя У. Маякоўскага быў праведзены калядны ранішнік «Под чистым небом Рождества», на якім прысутнічалі бацькі і вучні Нядзельнай школы прыхода храма святога Архангела Міхаіла г. Наваполацка. **18 студзеня** адбыўся канцэрт «Льются звуки жизни, счастья и добра, озаряя мысли светом Рождества», які быў падрыхтаваны супрацоўнікамі бібліятэкі і навучэнцамі Наваполацкага музычнага каледжа для клуба сталых людзей «Ещё не вечер».

Ладзілі бібліятэкі і мерапрыемствы, прысвечаныя Году навукі. **19 студзеня** ў дзіцячай бібліятэцы імя А. Пушкіна інжынер Юрый Лебедзеў для вучняў СШ № 3 правёў майстар-клас пад назвай «Наши руки не для скуки» па вырабе мадэляў тэхнікі. **31 студзеня** ў бібліятэцы імя К. Сіманава адбылося комплекснае мерапрыемства, якое складалася з прэзентацыі «Нобелеўскія лаўрэаты з беларускімі каранямі», рэкамендацыйнага агляду кніг і гутаркі па творчасці Святланы Алексіевіч.